латинского происхождения. Возьмем современные названия зубного геля “Fluogel” и зубных паст “Bifluor”, “Elhyfluor”, “Pâte dentifrice au fluor” [4]. При сопоставлении терминов-наименований паст, геля и их ингредиентов (fluorure de sodium, monofluorphosphate de sodium) очевидна общая латинская основа “fluor” во всех лексических единицах.

Таким образом, этимологические данные свидетельствуют о том, что фармацевтические стоматологические термины образуются преимущественно на базе латинских и греческих словообразовательных элементов. Активное многовековое воздействие этих классических языков на формирование исследуемой лексики оказало благотворное влияние на создание ее современного терминологического ядра, которое состоит из достаточного количества узкоспециальных терминов (33%), что позволяет считать стоматологическую фармацевтическую терминологию самостоятельной медицинской подсистемой, отражающей развитие и сущность научных знаний этой отрасли.

Литература


1. Шега Д.Г. Фармацевтическая терминология Авла Корнелия Цельса / Д.Г.Шега // Іноземна філологія: респ. міжвід. наук. зб. - Львів, 1987. - Вип. 85. - С. 64-69.
2. Шега Д.Г. Фармацевтическая терминология Скрибония Ларга / Д.Г.Шега // Іноземна філологія: респ. міжвід. наук. зб. Львів, 1983. Вип. 70. - С. 55-61.
3. Boissier R. Formulaire thérapeutique odontostomatologique / R.Boissier, A.Bouland. - Paris: L'expansion sientifique française, 1931. - 390 p.
4. Compeudium. Dixième édition. – Bruxelles: Association générale de l'industrie du médicament, 1992. - 1358 p.
5. Dubois J. Dictionnaire étymologique et historique du français /J.Dubois, H.Mitterand, A.Dauzat. - Paris: Larousse, 2007. - 893 p.


# РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСКАЙ МЕДЫЦЫНЫ СА СТАРАЖЫТНАСЦІ ДА НОВАГА ЧАСУ


Карнацкая В.І.

*УА «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»*


Медыцынскія і гігіенічныя веды зарадзіліся на самых ранніх этапах існавання чалавека (у Вавілоне, Егіпце, Індыі, Кітаі, Грэцыі, Блізкім Усходзе і інш.).

Медыцына Беларусі мае таксама даволі багатую гісторыю, самабытныя народныя традыцыі, якія выкарыстоўваліся нашымі продкамі на працягу некалькіх тысячагоддзяў іх існавання. Дзякуючы археалагічным, памантрапалагічным і палеапаталагічным даследванням, назапашаным нашымі вучонымі, мы маем магчымасць меркаваць аб фізічным здароўі старажытных людзей беларускай зямлі, іх хваробах, лекарскіх прыёмах, гігіенічных сродках.

Народная медыцына Беларусі назапасіла дастаткова звестак аб розных гаючых сродках, лекавых раслінах, гігіенічных навыках і іх практычным прымяненні для захавання здароўя, папярэджвання і лячэння розных хвароб. Яны перадаваліся вусна з пакаленняў у пакаленні, што адлюстравалася ў народных звычаях, прыказках, прымаўках, паданнях, а пазней, са з'яўленнем пісьменнасці, было замацавана ў зборніках беларускага фальклору, “Траўніках”, “Лячэбніках” і інш.

Становішча медыцыны заўсёды вызначалася ўзроўнем развіцця грамадства. У першабытных людзей ён быў вельмі нізкім. Іх жыццё поўнасцю залежыла ад прыроды, яе з'яў і наступстваў для здароўя. Бездапаможнасць перад сіламі прыроды, немагчымасць растлумачыць тыя, ці іншыя з'явы і звязаныя з імі захворванні і урэшце смерць – вялі да ўяўлення аб злых духах, якія пасяліліся ў арганізме чалавека. Для барацьбы з імі выкарыстоўвалі прымітыўныя спосабы лячэння, якія суправаджаліся рознымі рытуаламі, магічнымі дзеяннямі знахараў, шаманаў, чарадзеяў. Знахарства было пад уплывам рэлігійнай медыцыны, дзе уладарыла вера ў паходжанне ўсіх хвароб ад злых духаў. З дапамогай заклінанняў, малітваў, замоваў старажытныя жрацы выганялі іх з цела чалавека. У беларусаў захавалася шмат замоваў: ад ліхаманкі, лішая, скулы,



Репозиторий ГрГМУ

залатухі, каўтуна, зубнога болю, ляку, шалу, змяінага укусу, кровацячэння, ліхога вока, злога духа, нячыстай сілы і г.д. Так узнікалі зачаткі псіхатэрапіі.

Шмат паданняў і легенд Беларусі прысвечана язычніцкім багам (Даждбог, Святавіт, Ярыла, Вялес, Цётка, Пярун і г.д.), што ўвасаблялі розныя з'явы прыроды, гаспадарчую дзейнасць, ад якіх залежыла здароўе і жыццё людзей. Як жывая істота карміцелька і маці-парадзіха ўспрымалася ў народзе зямля., а таксама сонца, агонь, вада. Ім пакланяліся, шанавалі, рабілі ідалаў. У Рэспубліканскім музеі медыцыны экспануецца выява – старажытнаіндаеўрапейскай багіні Мары, абаронцы жанчыны-маці і навароджаных дзяцей, знойдзенай пры раскопках на нашай зямлі. Ёсць там амулет "Конік", што сімвалізаваў жыццё, медальён "Змеявік" ад 13 хваробаў і інш. Але сувязь знахарства і старажытных вераванняў з лекарскай справай тут не была ўсебаковай.

Народная медыцына дасягнула значнага ўзроўню, хоць і насіла эмпірычны характар. Для лячэння агульных і хірургічных захворванняў выкарыстоўваліся разнастайныя лекі расліннага, жывельнага і мінеральнага паходжання. Нашы продкі жылі па прынцыпу, які згадвае беларуская прымаўка: "што ў лесе родзіцца, у хаце знадобіцца". Бярозавым сокам лячылі гнойныя раны, палын ужывалі пры захворванні ліхаманкай, дёгаць – як дэзінфекцыйны сродак і г.д.

Лекары ўжывалі і хірургічныя метады: трэпанацыю чэрапа, у выпадку цяжкіх родаў – кесарава сячэння і эмбрыатамію, упраўлялі вывіхі, умелі лячыць пераломы касцей. Аб гэтым сведчаць экспанаты Рэспубліканскага музея гісторыі медыцыны, знойдзеныя пры раскопках магільнікаў або гарадзішчаў на Беларусі: сцегнавая костка, вылечаная пасля двайнога пералому, пасляховае загойванне пераломаў касцей прадплечча (X – XIII ст.ст); трэпанацыя мужчынскага чэрапа з ніжняй сківіцай і пломбай зуба (XIII – XIV ст.ст. і інш.).

Як сведчаць летапісы, у старадаўнія часы тут ведалі і лячылі г. зв. прыкарчэнні (артрыты, астэахандрозы), удушша (астма), ківанне долу (дрыготкі параліч), г. зв. дно (жоўцекамянёвая хвароба і ныркавая коліка).

Асобая ўвага надавалася барацьбе з морам (розныя эпідэмічныя хваробы). Летапісец згадвае пра мор ў Полацку 1092 г. Нашы продкі здаўна ўмелі спраўляцца з эпідэміямі. Для барацьбы супраць іх выкарыстоўвалі каранціны, ізалявалі хворых, спальвалі іх вопратку і трупы памерлых, хавалі асобна. З мэтай прафілактыкі і лячэння многіх хвароб выкарыстоўвалі лазні, ужывалі іншыя патагонныя меры: абкладвалі хворых гарачай цэглай, абкурвалі памяшканні ядлоўцам, паляпшалі вадазабеспячэнне, масцілі вуліцы і дарогі.

З прыняццем хрысціянства і яго распаўсюджваннем у Еўропе медыцына стала падуладнай хрысціянскай царкве. Першыя бальніцы і шпіталі былі створаны пры манастырах Францыі і Італіі, яшчэ ў раннім сярэднявеччы.

На беларускіх землях хрысціянства было прынята ў канцы X ст. На жаль, Полацкі летапіс быў страчаны пад час войнаў з Масковіяй, а іншыя крыніцы не захавалі звестак аб наяўнасці тут у XI – XIII ст.ст. бальніц ці шпіталяў. Але знойдзеныя ў Полацку, Тураве, Пінску скальпель, пінцэты, нажніцы і іншыя медінструменты, датуемыя X – XII ст., даюць падставы лічыць, што тут яны ўсе ж існавалі. Магчыма ў іх стварэнні прымалі ўдзел знакамітыя асветнікі князеўна-ігумення Еўфрасіння Полацкая і епіскап Кірыла Тураўскі.

Вядома, што з XII ст. царкоўныя саборы дазвалялі манахам лячыць людзей, але забаранялі ўсякія хірургічныя аперацыі, звязаныя з выкарыстаннем скальпеля (нажа), або прыпяканнем. Часта манахі-хірургі, шкадуючы параненых і хворых, парушалі прынятае рашэнне. Але з пачатку XIII ст. забарона была катэгарычнай пад пагрозай адлучэння ад царквы. Апраўдвалася гэта тым, што хрысціянству непрымальна праліцце крыві, і цела чалавека павінна быць недатыкальным для хірургічнага ўмяшальніцтва. Так урачы-хірургі былі пастаўлены па-за медыцынскай навукай і практыкай. Студэнты ствараемых з XIII ст. універсітэтаў былі пазбаўлены магчымасці займацца хірургіяй, якая лічылася "ніжэйшай прафесіяй". Ва ўніверсітэтах сярэднявечча панавала схаластычная медыцына. А паколькі ў XII – XIII ст. вялося шмат войнаў з вялікай колькасцю параненых, то патрэба ў практычнай хірургіі значна узрастала. І яе пачалі аказваць кастаправы і практыкі-цырульнікі. У вайсках нямецкіх гарадоў іх называлі фельдшарамі (ад ням. палявыя ножніцы). Пазней гэта назва прыйшла і на Беларусь.

Рэпазіторый ГрДМУ

Беларуская медыцына, хоць і не атрымала той багатай спадчыны, якую мелі Грэцыя, Італія, Францыя, шэраг арабскіх краін, але і яна развівалася не на пустым месцы, а была цесна звязана з еўрапейскай, асабліва ў эпоху росквіту ВКЛ (XV – XVI ст.ст.), эпоху Адраджэння і гуманізма.

На Беларусі па-ранейшаму існавалі 3 формы лячэбнай дапамогі: у хаце хворага, на кватэры лекара і ў спецыяльных лячэбніцах, часцей пры манастырах. Але эпоха Адраджэння прынесла і значныя змены ў развіцці медыцынскіх ведаў: вынаходніцтва мікраскопа прывяло да перавароту ў біялогіі (адкрыццё клеткі), знята забарона з навуковых даследванняў цела чалавека і яго псіхікі, лекары атрымалі магчымасць анатаміраваць трупы, шырокае распаўсюджванне атрымала свецкая медыцына.

З XV ст. на беларускіх землях з'явіліся свецкія прафесійныя лекары, выпускнікі медфакультэтаў Падуанскага, Гальскага, Пражскага, Кракаўскага і іншых універсітэтаў. Дакументальна вядома, што яшчэ ў 1397 г. у Празе пры медфакультэце універсітэта вучылася зямляцтва беларусаў. Знакаміты Ф. Скарына ў 1512 г. атрымаў званне доктара медыцыны ў Падуанскім універсітэце. Гісторыя згадвае, што яшчэ 17 беларусаў атрымалі званне доктара медыцыны толькі на пачатку XVI ст.

Вяртаючыся на радзіму, яны адкрывалі тут бальніцы і шпіталі, дзе з поспехам выкарыстоўвалі набытыя ў Еўропе веды. На будаўніцтва і ўтрыманне медыцынскіх устаноў значныя сродкі выдзяляла дзяржава, гарадскія магістраты, а таксама асабістыя ахвяраванні вялікіх князеў літоўскіх, магнатаў, рэлігійных структур. У 1495 г. у Брэсце, а потым і ў многіх іншых гарадах узніклі першыя стацыянарныя шпіталі для лячэння бедных і састарэлых. У XVI ст. амаль усе буйныя гарады Беларусі мелі такія шпіталі, нават па некалькі: да пачатку XVII ст. у Магілеве іх было ужо 13. Першыя аптэкі тут з'явіліся ў 1550 г.

Нягледзячы на развіцце шпітальнай сістэмы, яна не стала асноўнай у аказанні медыцынскай дапамогі насельніцтву ВКЛ. Шпіталі існавалі ў гарадах і часткова ў мястэчках, а большасць жыхароў былі вяскоўцамі, якіх лячылі цырульнікі-хірургі. Іх тут называлі бельверамі, а з XVII ст. – фельчарамі.

Цырульнікі не толькі стрыглі, галілі, рабілі манікюр і педыкюр, але і розныя хірургічныя аперацыі: ампутацыю канечнасцей, выпраўленне вывіхаў, накладванне шын на пераломы, вымалі асколкі з ранаў, зашывалі раздробленыя часткі цела і інш. Антысептычным сродкам для прамывання ран часта быў разведзены воцат і прысыпка камфарным парашком.

Цырульнікі-хірургі аб'ядноўваліся ў цэхі, мелі свае знакі адрознення – гербы, пячаткі. У канцы XVI ст. на беларускіх землях існавала больш за 150 такіх цэхаў у 40 гарадах і мястэчках і 33 аптэкі. Звычайна цэх меў 7-8 майстроў, 7-9 падмайстраў і 14-16 вучняў (хлопцаў). Навучанне апошніх вялося на працягу 3 год у розных майстроўлекараў і заканчвалася здачай экзамена, які ўключаў тэарэтычныя веды і практычныя навыкі.

У XIV – XVI ст. у ВКЛ, як і па ўсей Еўропе, перыядычна распаўсюджваліся эпідэмічныя захворванні воспы, чумы, халеры. Пад час эпідэмій зачыняліся вароты горада, забараняліся ярмаркі, сходы. Прызначаныя магістратам санітарныя наглядальнікі сачылі за выкананнем усіх гігіенічных мерапрыемстваў па барацьбе з заразнымі хваробамі, для папярэджання іх распаўсюджвання ўлады ВКЛ выдавалі спецыяльныя прывілеі і інструкцыі аб паводзінах жыхароў падчас узнікнення эпідэміі. Захавалася Інструкцыя Вялікага князя Жыгімонта I, а таксама прывілей каралевы Боны Сфорцы ад 1566 г. аб санітарна-гігіенічным стане жыхароў горада Гродна і іх водазабеспячэнні.

Вялікія князі літоўскія і большасць беларускіх магнатаў мелі не толькі ўстойлівыя палітычныя адносіны з еўрапейскімі краінамі і іх элітай, але і роднасныя сувязі. Гэта давала магчымасць запрашаць у свае палацы і маёнткі вядомых замежных лекараў. Так, жаніцьба ўладара ВКЛ і Польшчы Жыгімонта I Старога на міланскай герцагіні Боне Сфорцы паспрыяла прыезду на беларускія землі знакамітых італьянскіх урачоў Дж. Паламецці, Дж. Валянціна і і нш. Яны ўзбагачалі мясцовых лекараў заходнееўрапейскімі ведамі і вопытам дыягностыкі у лячэнні хворых.

Каштоўныя веды па медыцыне нашы ўрачы атрымлівалі і з твораў антычных грэцкіх, рымскіх , арабскіх і іншых медыкаў і філосафаў.

Такім чынам, беларуская медыцына разглядаемага перыяду амаль ні ў чым не саступала еўрапейскаму ўзроўню і развівалася аднолькавымі шляхамі.

# АНАЛИЗ РАБОТЫ ЭВАКОГОСПИТАЛЕЙ В БАШКИРСКОЙ АССР В ГОДЫ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

Киньябулатов А.У., Шарафутдинова Н.Х., Павлова М.Ю., Киньябулатова А.А.

*Башкирский государственный медицинский университет (Россия)*

Для активизации помощи госпиталям общественные организации проводили так называемые «Недели помощи госпиталям», в которых, по самым скромным данным 1944 г., участвовали 1500 активистов-шефов. В дни их проведения колхозники везли, отрывая из своего не очень богатого рациона, всевозможные овощи, свежее молоко и сметану, масло, творог, яйца, знаменитый башкирский липовый мёд и кумыс. Большим событием ежегодно для взрослых и детей республики становились отправка для раненых различных подарков. Девушки вышивали для раненых кисеты для табака, вязали тёплые перчатки и носки, шарфы и свитера, писали коллективно не менее согревающие душу бойца и командира письма. Всезнающая статистика подсчитала, например, что в течение первого года войны раненым, находящихся на излечении в госпиталях Башкортостана было подготовлено и вручено подарков на сумму свыше 1 млн рублей. Многие жители Уфы и других поселений покупали на собственные сбережения книги, музыкальные инструменты, настольные игры и приносили, привозили, посылали посылкой в госпиталя. Известные артисты башкирских драматических театров, филармонии и известные на весь Союз народные артисты Любовь Орлова, Сергей Образцов, украинские солисты театра оперы и балета выступали перед ранеными в госпиталях г. Уфы и других городов.

Железная необходимость своевременной подготовки боеспособных защитников Отчизны заставляла медиков-организаторов быть требовательными до строгости соблюдения лечебного и внутрислужебного режима госпиталей. Коллективы госпиталей подчинялись строгому алгоритму распорядка дня, выполнения лечебных процедур, оптимального корректирования врачебного назначения после обходов с учёными-консультантами, совершенствовали уход за ранеными. Ежемесячно военный комиссар каждого эвакогоспиталя отчитывался перед военкомом эвакоуправления №97.

Отчёт был в форме подробного донесения о работе за текущий период, анализировались количественное и качественное состояние раненых и больных, степень эффективности лечения, докладывалось о хирургических операциях, числе умерших и причинах смерти.

Чтобы раненые не отрывались от общих забот страны и армии, в госпиталях была хорошо поставлена информационная работа о положении дел на фронтах, в стране и за рубежом. Эвакогоспитали были радиофицированы, обеспечены достаточным количеством газет и журналов, в них работали библиотеки, демонстрировались кинофильмы, выпускались силами медицинского персонала и раненых боевые листки и стенные газеты. В госпиталях с первого дня их открытия функционировали перичные партийные и комсомольские организации, коммунисты становились на учёт в райкомах и горкомах партии. Это способствовало тому, что раненые рядовые и офицеры не теряли интереса к повседневным делам, не отчуждались от забот народа, а вышестоящие партийные организации получали правдивую информацию о настроениях воинов, о необходимой помощи госпиталям для принятия конкретных управленческих решений и постановки тех или иных вопросов перед вышестоящими хозяйственными, политическими и военными органами. Летом 1942 г. в партийных организациях госпиталей БАССР насчитывалось 250 членов и кандидатов в члены партии.

За годы войны, как свидетельствует статистика, в госпиталях республики было проведено более 5 тысяч концертов и свыше 16 тысяч киносеансов, прочитано 8 тысяч лекций и докладов.



Репозиторий ГрГМУ